**Дэманстрацыйны варыянт работы па вывучэнні**
ЧЫТАННЯ І РАЗУМЕННЯ ТЭКСТУ
(IV клас, 2022/2023 навучальны год)

**Інструкцыя**

На чытанне тэксту і выкананне заданняў адводзіцца 40 хвілін. Пры неабходнасці можна карыстацца чарнавіком.

1. Прачытайце тэкст.
2. Выканайце заданні.

Да некаторых пытанняў будзе прапанавана 4 варыянты адказу. Пастаўце знак ✓ у пустой клетачцы насупраць правільнага адказу. Напрыклад:

| |
|---|
| **4. Як называецца першы месяц вясны?**<br>☐ красавік<br>✓ сакавік<br>☐ май<br>☐ чэрвень |

Калі вы хочаце змяніць выбраны адказ, то закрэсліце яго і адзначце іншы правільны адказ. Напрыклад:

| |
|---|
| **4. Як называецца першы месяц вясны?**<br>☒ красавік<br>✓ сакавік<br>☐ май<br>☐ чэрвень |

Пры выкананні некаторых заданняў трэба напісаць свой адказ на лінеечках пад пытаннем. Напрыклад:

| |
|---|
| **2. У якую пару года адбыліся падзеі, пра якія расказваецца ў тэксце?** Напішыце: *ранняй вясной*______________________________. |

У заданнях, дзе трэба паказаць парадак падзей, пастаўце нумары падзей насупраць іх у пустых клетачках. Напрыклад:

| |
|---|
| **7. Пранумаруйце падзеі ў тым парадку, у якім яны адбыліся ў тэксце. Парадак падзей пазначце ў пустых клетачках лічбамі ад 1 да 4.**<br>*4* Расцвіла пралеска<br>*1* Зіма адступіла<br>*2* З'явіліся першыя праталіны<br>*3* Надышла вясна |

3. Калі вы не зможаце выканаць усе заданні, то зрабіце тыя, на якія ведаеце адказ.

Жадаем поспеху!